# Беларусь як дыялагічная прастора розных культурных традыцый*

*В. Я. Лагавік, выкладчык кафедры айчыннай гісторыі і сусветнай культуры Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта*

## Уводзіны

У сучаснай сітуацыі адбываецца інтэнсіўнае ўзаемадзеянне культур, сустрэча мінулага, сучаснага і будучага. З'явіліся ўмовы для вывучэння культур праз усведамленне, з аднаго боку, разнастайнасці культурных тыпаў, а з другога – адзінства агульначалавечай культуры. Гэта гуманістычны падыход, які зыходзіць са сцвярджэння тэзіса аб роўнасці культур і існавання разнастайных форм, якія гістарычна і ментальна прынялі культуры розных народаў. Трэба ўлічваць, што культура развіваецца праз зносіны, праз узаемадзеянні адбываецца яе самавылучэнне. І ў дыялогу ідзе здзяйсненне гуманізму, а назнанне дыялогу праз прызму беларускай культуры дазваляе выявіць яе характэрныя рысы, прыхаваныя магчымасці і гуманістычны патэнцыял.

Дыялог разглядаецца як змест і форма гуманітарнага мыслення. Пачынальнікам яго вывучэння ў культуралагічным плане быў М. М. Бахцін [1, с. 207–489]. Шэраг важных палажэнняў па праблеме дыялогу культур утрымліваецца ў працах В. С. Біблера, Л. М. Баткіна, А. Я. Гурэвіча, Ю. М. Лотмана, Г. Д. Гачава, М. С. Кагана і інш. Іх тэарэтыка-светапоглядныя распрацоўкі з'яўляюцца базай разумення аўтарам праблемы дыялогу культур.

## Асноўная частка

Тэма ўзаемадзеяння культур на Беларусі не з'яўляецца нечаканай узнiклай. Ф. Скарына ў прадмовах да сваіх выданняў арганічна спалучаў як усходнеславянскія, так і заходнееўрапейскія традыцыі. «Ён быў першай значнай асобай у працэсе ўзаемадзеяння» гэтых «макрарэгіёнаў» [2, с. 3]. Вядомы сувязі Скарыны як з заходняй (Піка дэла Мірандала, у прыватнасці), так і з усходняй культурай [3, с. 75]. Увогуле, Скарына быў сапраўды чалавекам сусветнага культурнага ўзроўню. Яго творчасць, погляды і ёсць вынік дыялогу культур.

Філасофскае асэнсаванне гэтай з'явы даў на пачатку XX ст. І. Абдзіраловіч (І. Канчэўскі). Праўда, яго назіранні датычыліся ў асноўным фарміравання менталітэту беларусаў. «Беларусь ад X веку і да гэтай пары, – пісаў ён, – з'яўляецца полем змагання двух кірункаў культуры – заходняга і ўсходняга... Мы, беларусы, ваганіся паміж двума культурнымі тыпамі» [4, с. 8].

Цікавыя звесткі аб перакрыжаваннях культур маюцца ў даследаваннях беларускіх літаратуразнаўцаў, мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў, этнографаў і інш. (Э. К. Дарашэвіч,

* Рэцэнзент – Э. К. Дарашэвіч, доктар філасофскіх навук, прафесар.

М. Ф. Пілпенка, С. І. Санько, У. М. Конан, В. М. Новікаў, В. Б. Евароўскі, Г. Галенчанка, С. А. Падокшын, В. П. Жураўлёў, В. Дадзёмава і інш.).

Мы далучаемся да гэтай праблемы і паспрабуем на прыкладах паказаць, як працэс узаемадзеяння (дыялогу) розных культурных традыцый адбіўся на беларускай культуры, як, нягледзячы на тое што важную ролю у развіцці культуры Беларусі адыгрывае дыялог паміж Захадам і Усходам, беларускія творцы самі шмат адметнага унеслі у гэты дыялог. Згодна з апісаным мы разглядаем Беларусь як дыялагічную прастору розных культурных традыцый, аналізуючы розныя формы гуманізму, іх праяву у беларускай культуры.

Па-першае, звернемся да міфалагічнай і фальклорнай спадчыны беларускай культуры. Для міфалагічнага светапогляду дахрысціянскага перыяду характэрны універсальны сінкрэтызм, адзінства іманентнага і трансцэндэнтнага. Адрозненні – у своеасаблівасці гістарычнага шляху кожнага народа, у трансфармацыі міфа у жыцці і культуры, у мове, звычаях і рытуалах. У эпоху хрысціянізацыі беларускіх земляў «міфы паслужылі архетыпамі сінкрэтычнай народнай культуры, якая сфарміравалася пад духоўным уплывам хрысціянства» [5, с. 29].

Ад старажытнасці і да пачатку II тыс. н. э. выдзяляюць два напрамкі, якія вызначалі культурныя феномены на тэрыторыі нашага краю. Ёсць дзве мадэлі славянскай каланізацыі тэрыторыі Беларусі, спрадвеку заселенай мясцовымі балтамі. І тут з аднаго боку – каланізацыя з Поўначы (Сядоў) або з Поўдня (Трацякоў), з другога боку – з Захаду (Пяркаўка, Шадыра і інш.) або Усходу (Трубачоў) [6, с. 101].

З II тыс. н. э. фарміруецца новы феномен еўрапейскай цывілізацыі – беларуская традыцыйная культура як вынік сінкрэтызму двух напрамкаў «поўдзень – поўнач», і новы сінтэз у напрамку «захад – усход». Як вынік – фарміраванне беларускай мовы (лексікі і фанетыкі). Адлюстраваннем гэтага сінтэзу з'яўляюцца рэгіянальныя асаблівасці беларускай гутарковай мовы, яе тэрытарыяльны падзел [7, с. 6].

Перапляценне паўднёвых і паўночных, усходніх і заходніх еўрапейскіх традыцый назіраецца у гісторыі календара і звязаных з ім свят Беларусі. Усходняя – летазлічэнне ад стварэння свету (новы год прыпадаў на вясну і адзначаўся багатым у мастацкім сэнсе валачобным святам). Заходняя – ад нараджэння Хрыста (традыцыя адзначаць навагоднія свята зімой). «Зімовыя каляды набылі асабліва важнае значэнне на поўдні Беларусі, а ранейшае валачобнае свята у мадыфікацыйнай форме захавалася пераважна на поўначы. Яно было прыстасавана да хрысціянскага свята Вялікдня, злілося з ім» [7, с. 6].

Згадаем, што на гэтых землях была вядома элінская культура, а потым грэчаская вера (як тады называлі праваслаўе). І Кірыл Тураўскі, і Ефрасіння Полацкая, і Клімент Смаляціч выхоўваліся на грэчаскай культуры, веры, прывітай на народную глебу. Жаночыя партрэты-фрэскі Спаскай царквы у Полацку маюць рысы грэчаскай вобразнасці. «Вядома, трансляцыя... ішла праз Візантыю, ролю якой для нас цяжка пераацаніць, наколькі наша духоўная спадчына знітавана з ею» [3, с. 33–34].

Перыяд Адраджэння у Беларусі характарызуецца станауленнем нацыянальнай, уласна беларускай культуры.

Рэлігійная культура беларусаў дае прыклады прамога узаемадзеяння і сінтэзу усходніх і заходніх традыцый. Дыялог паміж усходнім і заходнім хрысціянствам становіцца галоўным дыялогам. Гэтаму спрыяла і геапалітычнае становішча нашай краіны.

Пачынаючы са Скарыны рэнесансавы гуманізм, ідэя служэння агульнаму дабру, прымаў выгляд «хрысціянскага гуманізму», г. зн. «светапогляду, які, не парываючы з асноўнымі прынцыпамі хрысціянства, імкнуўся рэалізаваць некаторыя яго традыцыйна-сярэднявечныя уяўленні і паняцці. Так, ідэя індывідуальнай, суб'ектыўнай свабоды у большай ступені абмяжоўвалася інтарэсамі агульнага дабра, што тлумачылася больш нізкім узроўнем раннебуржуазнага развіцця, старажытнай грамадска-культурнай і рэлігійна-праваслаўнай саборнай традыцый». На беларускіх землях са старажытнасці этнічна рэгіянальная самасвядомасць людзей была скіравана да абшчыннасці, супольнасці [8, с. 5–13].

Фарміруецца беларускі менталітэт – «спецыфічны спосаб светаўспрымання і светаадчування, які вызначае нацыянальны характар

і своеасаблівасць духоўнай культуры Беларусі» [9, с. 75], які абгрунтаваў Скарына. Гэта неабходнасць сінтэзу каштоўнасцей і ідэалаў Усходу і Захаду, дасягнення паміж імі культурна-рэлігійнай згоды, паразумення.

Не ўсё тлумачыцца толькі сутыкненнем двух полюсаў, якія накладваліся на глыбінную айчынную глебу. Таму такі «рафінавана адукаваны» ў заходняй культуры аўтар, як М. Гусоўскі, з замілаваннем успрымаў матчынную мясцовую міфалогію [10]. І геній беларускага народа Ф. Скарына не толькі класічна сінтэзаваў усходнюю і заходнюю культуры, але і праз спалучэнне глыбінных пластоў народнай культуры з дыялогам паміж Захадам і Усходам, па-сутнасці, даў творчую энергію вытокам больш пазнейшай, у тым ліку і сучаснай, беларускай культуры.

Першае беларускае Адраджэнне выклікала небывалы ўздым нацыянальна-патрыятычнага пачуцця. Можна назіраць сцвярджэнне сацыяльнай гармоніі, прававой дзяржавы, адзінства хрысціянскай цывілізацыі (творчасць Ф. Скарыны, М. Гусоўскага і іх паслядоўнікаў) [11]. Сацыяльна-прававым увасабленнем гэтых ідэй былі тры рэдакцыі Статута ВКЛ — 1529, 1566, 1588 гг. [12], а духоўна-творчым — развіццё свецкай літаратуры, выяўленчага мастацтва, першая беларуская Біблія, перакладзеная Ф. Скарынам на родную мову са сваімі каментарыямі [5, с. 30; 9, с. 82–83, 92; 13, с. 7].

Можна сцвярджаць, што ў перыяд першага Адраджэння беларуская ідэя – ідэя развіцця айчыннай культуры на беларускай мове – дамінавала ў нацыянальнай самасвядомасці беларусаў. Ёю былі ахоплены амаль што ўсе пласты беларускага грамадства, у тым ліку пэўная частка феадальнага класа.

З 70–80-х гадоў XVI ст. пачала ўсё больш назірацца абыякавасць беларускіх феадалаў да справы нацыянальна-культурнага развіцця. У адрас духоўных настаўнікаў у выдадзеным Евангеллі на тагачаснай беларускай мове (у духоўнай пісьменнасці ўжывалася царкоўнаславянская мова) В. Цяпінскі кідае горкі папрок: «Але бы хот сомое писмо свое... уважали» [11, с. 35]. Ён першы ў гісторыі айчыннай думкі паставіў праблему выратавання нацыянальнай культуры беларускага народа. Праз тры стагоддзі амаль што з такімі ж словамі звярнуўся да беларусаў Ф. Багушэвіч.

Нягледзячы на тое што з Брэсцкай царкоўнай уніі (1596 г.) пачынаецца інтэнсіўная паланізацыя беларускіх «вярхоў», часткова культурнага жыцця Беларусі, беларуская мова і культура не перасталі існаваць. Яны набылі іншыя формы і засталіся бытаваць у іншых пластах насельніцтва (сялянства). Ды і сама часткова паланізаваная беларуская шляхта была носьбітам не толькі польскай свядомасці, а «ліцвінскай», называла сябе ліцвінамі і русінамі ад назвы дзяржавы, у якой жыла, разумела унікальнасць беларускай культуры (зборы помнікаў даўніны ў рэзідэнцыях Тызенгаузаў, Астрожскіх, Солтанаў, Алелькавічэй, Друцкіх, Глінскіх, Храптовічаў, Агінскіх). А неаднаразовыя спробы магнатаў, напрыклад Радзівілаў, Сапегаў, аддзяліць ВКЛ ад Каралеўства Польскага пацвярджаюць гэта [3, с. 110].

Стратэгію прымусу выкарыстоўвала і расійскае самадзяржаўе. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь увайшла ў склад Расійскай імперыі, у выніку чаго пачалася русіфікацыя беларускага грамадскага і духоўнага жыцця, гвалтоўнае насаджэнне ў культуру і свядомасць народа іншых каштоўнасцей і ідэалаў. Адной з адыёзных праяў гэтага была забарона ўжывання ў афіцыйным грамадска-палітычным і духоўна-культурным жыцці беларусаў роднай мовы. На ролю «духоўных бацькоў» нашага народа прэтэндуюць ідэолагі сумнавядомага «заходнерусізму», якія дапамагалі самадзяржаўю пазбавіць беларускі народ уласнай нацыянальнай самасвядомасці. Гэты працэс знайшоў адлюстраванне ў працы А. Цвікевіча «Западно-руссизм» [14].

Але з канца XVIII – пачатку XIX ст. узрастае цікавасць да гісторыі Беларусі, беларускага этнасу, узнікаюць канцэпцыі народнага жыцця, навагі да народа і новыя афармленні гуманізму.

На пачатку XIX ст. з пашырэннем рамантызму і дэмакратычных ідэй прачнулася цікаўнасць да народнай творчасці – песень, казак, паданняў. Імі цікавяцца філаматы і філарэты, А. Міцкевіч, чыя паэзія прасякнута беларускім фальклорам. Да сярэдзіны стагоддзя з'яўляецца шэраг польска-беларускіх паэтаў і пісьменнікаў: Я. Баршчэўскі, Я. Чачот, В. Каратынскі, А. Рыпінскі, В. Дунін-Марцінкевіч і інш. Дзеячы беларускай культуры

імкнуцца выклікаць у народзе пачуццё нацыянальнай годнасці. Пачынаецца вывучэнне звычаяў, абрадаў, багатай фальклорнай спадчыны беларускага народа. Найбольшы размах гэты працэс атрымаў у другой палове XIX ст., калі не толькі гісторыкі, філолагі і этнографы, але і мастакі збіраюць, сістэматызуюць і вывучаюць фальклор і народнае, прыкладное мастацтва Беларусі (этнографы Е. Раманаў, П. Шэйн, А. Дэмбавецкі, І. Насовіч; шэраг цікавых замалёвак быту беларускіх сялян зрабіў рускі скульптар М. Мікешын [15, с. 8]; малюнкі Напалеона Орды; праца М. Ельскага па зборы, апрацоўцы, вывучэнні музычнага фальклору і інш.).

Менавіта з сярэдзіны XIX ст. можна гаварыць пра выспяванне беларускай нацыянальнай свядомасці. Ужо у выказваннях К. Каліноўскага беларуская нацыянальная свядомасць набывае выразны характар. Так, нацыянальны гуманізм зліты з класавым. Ф. Багушэвіч будзіў нацыянальную свядомасць сялян і заклікаў іх да змагання за сваё нацыянальнае ды сацыяльнае вызваленне. І былі людзі, якія звязвалі свой лёс з сялянствам, якое захавала цудоўны фальклор, багатую гутарковую мову. Неабходна было ствараць беларускую літаратуру, распрацоўваць літаратурную мову, пашыраць нацыянальную свядомасць. На гэты шлях ступала усё больш людзей з дэмакратычнымі і рэвалюцыйнымі поглядамі.

Наступны перыяд – набыццё Беларуссю дзяржаўнасці (БНР і БССР) – адыграў, безумоўна, найзначнейшую ролю для умацавання нацыянальнай культуры, свядомасці.

Адносна перыяду «беларусізацыі», які адбыўся у 20-я гады XX ст., у навуковай літаратуры ёсць некалькі меркаванняў [3, с. 136].

Па-першае, гэта быў перыяд адраджэння і развіцця як нацыянальнай культуры беларусаў, так і іншых этнакультур: польскай, яўрэйскай, татарскай, літоўскай, латышскай і інш. Некаторыя дасягненні таго часу адыгралі станоўчую ролю для існавання беларускай культуры.

Па-другое, агульны пад'ём культуры ці, хутчэй, агульнае натхненне і спадзяванне на духоўны уздым спарадзілі некаторыя з'явы новых культуракомплексаў (Віцебскі феномен, ці Віцебскі рэнесанс), якія мелі культурны уплыў еўрапейскага і нават сусветнага маштабу, сапраўдная сутнасць гэтых культуракомплексаў стала зразумела толькі сення.

Па-трэцяе, наступныя перыяды былі шмат у чым разбуральныя у адносінах да этнічных культур, але некаторыя пазітыўныя моманты былі захаваны і так ці інакш паўплывалі на развіццё культуры Беларусі.

Нельга не нагадзіцца, што прафесійна інстытуцыялізаваліся практычна усе віды мастацтва. І амаль усе з іх на працягу XX ст. далі узоры твораў еўрапейскага і сусветнага узроўню. Дастаткова нагадаць імёны В. Быкава, А. Адамовіча, У. Караткевіча, Р. Барадуліна, А. Разанава, А. Макаёнка, А. Дударава і інш. у літаратуры; В. Турава, В. Рубінчыка, М. Пташука – у кіно; А. Глебава, Л. Ржэцкую, У. Дзядзюшку, З. Стому, В. Раеўскага, Б. Луцэнку і інш. – у тэатры; Я. Глебава, С. Картэса, Э. Ханка – у музыцы; В. Елізар'ева – у балеце; М. Савіцкага, З. Азгура, А. Анікейчыка, В. Грамыку, А. Кашкурэвіча, М. Селешчука і інш. – у выяўленчым мастацтве.

За мінулае стагоддзе працэсы узаемадзеяння і узаемапранікнення культур розных народаў дасягнулі высокага узроўню як у штодзённым жыцці (адзенне, ежа, стравы, навучанне, адпачынак і шмат што яшчэ), так і у літаратуры, тэатры, жывапісе і інш. Працэсы індустрыялізацыі, урбанізацыі, вынікі Першай і Другой сусветных войнаў у значнай ступені зраўнавалі нацыянальна-этнічныя асаблівасці этнагруп на савецкіх абшарах і садзейнічалі нівеліраванню іх стылю жыцця і культуры.

Тым больш цікава, што насля доўгага і пакутлівага, але паспяховага шляху да уласнай дзяржаўнасці, шляху, дзе магчыма было неаднойчы страціць сваю адметнасць, народ знаходзіць сілы, якія дазваляюць ствараць генетычна аўтахтонныя, адметныя культурныя узоры, што напаўняюць адпаведным зместам нават такія дэкларатыўнаштучныя, канструктывісцкія утварэнні, як мастацтва мадэрнізму і постмадэрнізму. І падставы для гэтага ёсць. Гэта тыя патэнцыі глыбока укаранёнага у народзе свайго нацыянальнага, якія ніколі не знікалі. Праз дыялог (узаемадзеянне), які па прыродзе гуманістычны, адбывалася узбагачэнне і захаванне адметных рыс беларускай гуманітарнай культуры, мастацтва.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. *Бахтин, М. М.* Проблемы творчества / М. М. Бахтин // М. М. Бахтин. Проблема поэтики Достоевского. – Киев : NEXT, 1994. – 509 с.

2. *Мальдзіс, А. І.* Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і узаемадзеяння людзей і народаў / А. І. Мальдзіс // АН БССР; Беларус. кам. славістаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 34 с.

3. Культурная спадчына: Культуралагічна-сацыялагічныя даследванні / Э. Дарашэвіч, Ул. Конан і інш. ; уклад., пав. рэд. і аўтар прадм. праф. Э. Дарашэвіч. – Мінск : Сучаснае слова, 2001. – 168 с.

4. *Абдзіраловіч, І.* Адвечным шляхам: Дасьледзіны беларускага сьветагляду / І. Абдзіраловіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 44 с.

5. *Конан, У. М.* Філасофская думка Беларусі ў кантэксце еўрапейскай філасофіі: гістарычная тыпалогія // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. Т. 1. Эпоха Сярэднявечча / В. Б. Евароўскі [і інш.] ; рэдкал.: В. Б. Евароўскі [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Бел. навука, 2008. – С. 29–32.

6. *Санько, С. І.* Мадэль другая: Беларусь паміж Поўднем і Поўначчу // Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. Т. 1. Эпоха Сярэднявечча / В. Б. Евароўскі [і інш.] ; рэдкал.: В. Б. Евароўскі [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі. – Мінск : Бел. навука, 2008. – С. 100–102.

7. *Піліпенка, М.* Беларуская традыцыйная культура як феномен еўрапейскай цывілізацыі / М. Піліпенка // Беларусіка=Albaruthenica. 6. Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальн., міжрэлігійн. і міжкультур. узаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Ч. 1. / рэд. Ул. Конан [і інш.]. – Мінск : ННАЦ імя Ф. Скарыны, 1997. – 356 с.

8. *Болбас, В. С.* Педагагічная думка Беларусі эпохі Адраджэння аб выхаванні этнічнай самасвядомасці моладзі / В. С. Болбас // Нацыянальная самасвядомасць і выхаванне моладзі. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 1996. – С. 5–13.

9. *Падокшын, С. А.* Беларуская думка ў кантэксце гісторыі і культуры / С. А. Падокшын. – Мінск : Бел. навука, 2003. – 316 с.

10. *Гусоўскі, М.* Песня пра зубра: на лац., беларус., рус. мовах / М. Гусоўскі. – Мінск : Маст. літ., 1980. – 191 с.

11. Прадмовы і пасляслоўі паслядоўнікаў Францыска Скарыны / АН БССР, Ін-т літ. імя Я. Купалы; [Уклад, уступ. арт. і камент. У. Г. Кароткага]. – Мінск : Навука і тэхніка. 1991. – 309 с.

12. Статут Вялікага княства Літоўскага 1588: тэксты; давед. камент. / Белорус сав. энцыкл. ; рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 573 с.

13. Беларуская кафля = Белорусские изразцы : Альбом / аўт. тэксту і склад.: В. Е. Собаль, М. А. Ткачоў, А. А. Трусаў, У. В. Угрыновіч. – Мінск : Беларусь, 1989. – 159 с.

14. *Цьвікевіч, А.* «Западно-руссизм»: Нарысы з гісторыі грамадскай мысьлі на Беларусі ў XIX в. і пач. XX в. / А. Цьвікевіч / пасляся. А. Ліса. – 2-е выд. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993.

15. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / Т. 3: Канец XVIII ст. – пач. XIX ст. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 448 с.


Атрымана 30.12.10.